ROCZNIKI HUMANISTYCZNE
Tom LII, zeszyt 7 – 2004

АКСАНА КУЗЬМЯНОК

# ЭВАЛЮЦЫЯ ВОБРАЗА КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Для беларускага народа, яго нацыянальнага і культурнага самапазнання постаць Кастуся Каліноўскага з'яўляецца знакавай. Беларускі паўстанец 1863 г. стаў сімвалам нацыянальнага адраджэння, патрыятызму, аб'ектам ідэалагічных і палітычных спрэчак і дыскусій, а таксама героем шматлікіх мастацкіх твораў. Паказальна, што мастацкі вобраз К. Каліноўскага ў многім залежыў ад характару эпохі, у якую быў створаны той ці іншы літаратурны твор. Паўстае заканамернае пытанне: як мянялася адлюстраванне вобраза К. Каліноўскага ў літаратуры ў залежнасці ад палітычнай і ідэалагічнай сітуацыі, ці было яно аднолькавым у розныя часы?

На сёняшні дзень у беларускай літаратуры ўжо выпрацавалася трывалая традыцыя адлюстравання вобраза К. Каліноўскага. На гэта спатрэбілася шматгадовая пісьменніцкая праца.

Упершыню як герой мастацкага твора К. Каліноўскі прысутнічае ў дылогіі рускага пісьменніка У. Крастоўскага *Крывавы пуф*, якая складаецца з двух раманаў – *Панургаў статак* (1869) і *Дзве сілы* (1874). Напісаны з прарасійскіх шавіністычных пазіцый, твор цалкам адпавядаў пануючай у другой палове XIX ст. палітыцы выкрыцця нацыянальна-вызваленчага руху на беларускіх і польскіх землях. У многім абапіраючыся на *Сведения* В. Ратча і выкарыстоўваючы прыёмы авантурнага апавя-

Mgr AKSANA KUŹMIANOK – doktorantka Katedry Historii Literatury Białoruskiej Uniwersytetu Państwowego Białorusi; adres do korespondencji: ul. K. Marksa, 31, p. 56, 220050, Mińsk, Białoruś.

дання, У. Крастоўскі стварыў дылогію-пасквіль, якая цалкам укладаецца ў каноны антынігілістычных твораў 60-70-х гадоў XIX ст., пераважна бездапаможных у мастацкіх адносінах. В. Каваленка ў кнізе *Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры* даў сціслую характарыстыку дылогіі як характэрнага прыклада рэакцыйнай дэміфалагізацыі. Паводле яго меркавання, спроба разбурыць легендарны арэол вакол паўстання 1863 года і прынізіць вобраз К. Каліноўскага была няўдала выкананым палітычным „заказам”. Даследчык лічыць, што У. Крастоўскі дробязнае і прыватнае выдае за галоўнае, за самае сэнсавае і тыповае і, надаўшы свайму твору вонкава дакументальныя рысы, „часткай праўды аўтар як бы падмяняе ўсю праўду”[1].

У канцы XIX ст. выходзіць яшчэ адзін мастацкі твор, у якім ёсць згадкі пра К. Каліноўскага. Гэта раман-хроніка рускага аўтара С. Арліцкага *Далёкія гады*, напісаны ў форме ўспамінаў пра ўласны лёс і грамадска-палітычнае жыццё Расійскай імперыі і яе „правінцыі” Паўночна-Заходняга краю. Пісьменнік нібы апраўдваецца перад рускім грамадствам за свой юначы малаасэнсаваны парыў – удзел у „польскім” паўстанні 1863-1864 гг., згадвае пра тыя падзеі, як пра „смутный полузабытый сон”[2]. Вызваленчы рух і барацьбу за незалежнасць С. Арліцкі малюе як цалкам адмоўную з'яву, на фоне якой прыкметна вылучаецца выключная і неардынарная постаць К. Каліноўскага.

Уплыў палітыкі Расійскай імперыі на ідэалогію і культуру Беларусі аказаўся вельмі моцным. На жаль, трэба канстатаваць, што ў апошняй трэці XIX ст. увагу тагачасных дзеячаў беларускай культуры асоба К. Каліноўскага не прыцягвала. Так, Я. Лучына, які прысвяціў падзеям паўстання абразок *З крывавых дзён. Эпізод з паўстання 1863 году на Міншчыне*, і Ф. Багушэвіч, непасрэдны ўдзельнік паўстання, не пакінулі ў сваёй творчай спадчыне ніякіх згадак пра беларускага змагара. Пачатак XX ст. таксама не прынёс мастацкіх твораў, у якіх фігураваў бы К. Каліноўскі.

Да постаці К. Каліноўскага беларускія пісьменнікі звяртаюцца толькі ў 20-я гг. XX ст. на хвалі ўздыму адраджэнскага руху. Гэта быў спрыяльны

---

[1] В. Каваленка, *Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры*, Мінск 1981, с. 52.

[2] С. Орлицкий, *Далёкие годы: роман-хроника*, в 3 ч., „Наблюдатель” 1898, № 9, с. 225.

перыяд для развіцця і пашырэння сферы функцыянавання беларускай культуры. З'явілася патрэба ў незвычайным, яркім, моцным героі, які б стаў увасабленнем нацыянальнай ідэі і гістарычнай памяці беларускага народа. Менавіта такога героя ўбачылі беларускія пісьменнікі ў К. Каліноўскім. Першым творам беларускай літаратуры, у якім быў увасоблены вобраз паўстанца, стала гістарычная п'еса Е. Міровіча *Кастусь Каліноўскі*, з поспехам пастаўленая ў 1923 г. на сцэне БДТ-1 самім аўтарам. П'еса Е. Міровіча стала значнай падзеяй у тэатральным жыцці Беларусі і зрабіла вялікі ўплыў на папулярызацыю імя К. Каліноўскага ў беларускім грамадстве.

Знаёмства ў п'есе з вобразам К. Каліноўскага пераконвае, што гэта асоба незвычайная, палымяная і бескампрамісная. Ён непахісны і рашучы, горача адстойвае свае перакананні, дзёрзкі і катэгарычны з усімі, хто з ім не згодзен. Е. Міровіч імкнецца паказаць у першую чаргу не Каліноўскага-чалавека, а Каліноўскага-рэвалюцыянера, дзейснага арганізатара і кіраўніка паўстання. Разам з тым гэта чалавек надзвычай імпульсіўны і гарачлівы, які часам не можа стрымаць свайго тэмпераменту. Як асоба, здольная на шчырыя, моцныя пачуцці, К. Каліноўскі паказаны ў сцэне развітання з Грыпінай Старжынскай. Такім чынам, пісьменнік стварае надзвычай яркі і шматгранны вобраз беларускага паўстанца ў рэчышчы рамантызацыі і гераізацыі. Але часам драматургу не ўдаецца пазбегнуць штучнасці і павярхоўнасці. Так, не вельмі пераканальным і натуральным бачыцца герой, калі ён, у лепшых традыцыях авантурнага жанру, з'яўляецца то ў абліччы праваслаўнага дыякана, то ў форме казацкага афіцэра ці простага салдата. У гэтых акцыях К. Каліноўскі паўстае хутчэй як неабачлівы і легкадумны авантурнік, а не мудры і спрактыкаваны кіраўнік паўстання. П'еса заканчваецца бунтам, які пачаўся ў турме падчас пакарання К. Каліноўскага на турэмным двары. Тым самым Е. Міровіч імкнецца сцвердзіць думку аб неўміручасці памяці пра К. Каліноўскага і справы, за якую ён аддаў жыццё.

Твор Е. Міровіча выклікаў значную цікавасць да асобы К. Каліноўскага ў беларускім грамадстве і стаў магутным штуршком, з якога пачалося плённае мастацкае асэнсаванне ролі К. Каліноўскага ў беларускай гісторыі. Услед за Е. Міровічам у перыяд беларусізацыі было напісана некалькі вершаў і паэма, прысвечаных змагару. Вершы гэтага перыяду паэтаў А. Гурло, А. Зіменкі, А. Дудара, Я. Падабеда, В. Маракова і інш. прасякнуты гераіка-патрыятычным пафасам, а К. Каліноўскі паўстае як увасабленне

высакародства, мужнасці, вернасці свайму народу і ідэалам вызваленчай барацьбы.

У гэты ж час з’явілася невялікая паэма А. Вольнага *Кастусь Каліноўскі* (1925). Яна складаецца з XIII раздзелаў-маналогаў К. Каліноўскага, З. Серакоўскага, М. Мураўёва, паўстанцаў-сялян і аўтарскіх разважанняў. Паэт дае слова розным прадстаўнікам вызваленчага руху („чырвоным”, „белым”, сялянам), а таксама іх ворагам. Падзеі ў паэме паказаны даволі схематычна, адпаведна з існуючым у той час поглядам на паўстанне 1863-1864 гг. На першым плане – сацыяльная свабода, якая яднаецца з ідэяй нацыянальнай незалежнасці. К. Каліноўскі паўстае ў паэме як народны заступнік, змагар за свабоду, глыбока трагічная постаць. Сумам і журбою прасякнуты XI і XII раздзелы паэмы, напісаныя ў форме стылізацыі пад фальклорную песню:

Эх, Кастусь, наш таварыш буяны…
Паглядзі: вунь дзве зоркі скаціліся,
Воран карканнем сціхнуць радзіць,
Нават коні табунамі збіліся…
Ой, ды нехта паўстанню здрадзіць[3].

На нашу думку, у гэтых раздзелах аўтар таксама імкнецца наследаваць і творча выкарыстоўваць некаторыя асаблівасці паэтыкі *Слова пра паход Ігаравы*. Але наогул, паэма напісана ў рэчышчы маладнякоўскай эстэтыкі: яна прасякнута настроем незадаволенасці, заклікам да бунту.

З завяршэннем палітыкі беларусізацыі ў Савецкай Беларусі ў 30-я гг. постаць паўстанца 1863 г. становіцца „небяспечнай” для афіцыйнай ідэалогіі. К. Каліноўскага пачалі лічыць бунтаром, героем польскай шляхты, а дзеячоў культуры, якія звярталіся да асобы беларускага змагара, абвінавачвалі ў нацыяналізме. Як сведчыць В. Шалькевіч, „ацэнка рэвалюцыйнай дзейнасці і светапогляду Кастуся Каліноўскага ў 30-ыя гады адкацілася на пазіцыі XIX стагоддзя”[4]. У тагачаснай літаратуры амаль няма твораў, прысвечаных К. Каліноўскаму, і таму яго імя аказалася ў забыцці. Але ў тыя ж 30-я гг. постаць К. Каліноўскага знайшла адлюстраванне ў творчасці заходнебеларускіх паэтаў М. Машары і М. Танка. Яны, як і К. Каліноўскі, бралі ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху, таму постаць рэв-

[3] А. В о л ь н ы,. *Кастусь Каліноўскі*, „Савецкая Беларусь” 1925, 15 красавіка, с. 2.
[4] В. Ш а л ь к е в і ч, *Ля вытокаў*, „Літаратура і мастацтва” 1990, 12 кастрычніка, с. 16.

алюцыянера для гэтых паэтаў была асабліва прыцягальнай. М. Машара ў паэме *Смерць Каліноўскага* (1934), на жаль, не выявіў арыгінальнага бачання асобы К. Каліноўскага, вобраз якога выкарыстоўваецца для ўзмацнення патрыятычнага пафасу твора. Больш цікавае ў мастацкіх адносінах увасабленне вобраз К. Каліноўскага атрымаў у паэме М. Танка *Кастусь Каліноўскі* (1938). Паэт стварыў па-філасофску глыбокі, лірычнапранікнёны твор, скразной ідэяй якога з'яўляецца вера ў духоўную моц і патэнцыял лепшых прадстаўнікоў беларускага народа:

Але сёння ўжо добра пазналі,
Як не лёгка ў народзе згасіць
Нашу праўду, калі яна пала
Іскрай бунту ў стрэх каласы[5].

Да вобраза К. Каліноўскага зноў звярнуліся ў час Вялікай Айчыннай вайны, калі трэба было абудзіць патрыятычны дух народа, паказаць прыклад мужнасці і самаахвярнай барацьбы за бацькаўшчыну. Для падняцця нацыянальнай самасвядомасці і патрыятызму неабходны былі прыклады не толькі з сучаснага, але і з гераічнага мінулага беларускага народа. Імя К. Каліноўскага пачало вяртацца ў беларускі кантэкст. У 1943 г. П. Броўка напісаў верш *Кастусь Каліноўскі*, які дагэтуль з'яўляецца праграмным творам па беларускай літаратуры. Паэт узвышае вобраз К. Каліноўскага да сімвалу мужнасці, няскоранасці захопнікам.

Неўзабаве пасля заканчэння вайны ў 1947 г. на сцэне Беларускага акадэмічнага тэатра была ажыццёўлена пастаноўка оперы Д. Лукаса *Кастусь Каліноўскі*, лібрэта да якой напісаў М. Клімковіч. Аўтар стварае ўзнёсла-рамантычны вобраз народнага героя. Характар К. Каліноўскага раскрываецца праз яго маналогі, разважанні, а таксама праз узаемаадносіны з іншымі героямі. З каханай Вольгай ён пяшчотны і ласкавы, з паплечнікамі-паўстанцамі – сур'ёзны і мудры, а з ворагамі – непахісны і адважны. Усе думкі, мары і ўчынкі К. Каліноўскага канцэнтруюцца вакол адной мэты – вызваліць родны край з-пад царскага і панскага прыгнёту. У лібрэта пераважае ўзнёсласць, патэтычнасць, абагульненасць вобразаў. Героі твора – не столькі рэальныя гістарычныя асобы, колькі тыпізаваныя вобразы рэвалюцыянераў-дэмакратаў. Сярод недахопаў лібрэта можна

[5] М. Танк, *Кастусь Каліноўскі*, у: *Жыві ў свабодзе: Кніга пра Каліноўскага*, Мінск 1996, с. 47.

адзначыць схематызм і штучнаць у абмалёўцы персанажаў, павярхоўнасць і спрошчанасць канфліктаў.

У пасляваенны час і таксама ў 60-я гг., калі пачалася так званая „адліга” ў грамадскім жыцці, постаць К. Каліноўскага прыцягнула асаблівую ўвагу беларускіх пісьменнікаў. Паэтычныя творы, прысвечаныя К. Каліноўскаму, напісалі В. Макарэвіч, Р. Семашкевіч, С. Законнікаў, М. Лужанін, А. Лойка, А. Дэбіш, Р. Баравікова, Л. Геніюш, Н. Мацяш, В. Шніп, А. Разанаў, Я. Сіпакоў, К. Цвірка, У. Зуёнак, А. Бачыла, Д. Бічэль-Загнетава, К. Кірэенка і інш. Адлюстраванне вобраза К. Каліноўскага адбывалася ў адпаведнасці з тымі ж ідэйна-эстэтычнымі прынцыпамі, якія былі выпрацаваны яшчэ ў 20-я гг. XX ст. Паэты рамантызуюць і гераізуюць вобраз народнага змагара, імкнуцца стварыць высакародны, велічны ідэал нацыянальнага героя.

Падзеям паўстання 1863-1864 гг. прысвечана і п’еса У. Караткевіча *Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць*, напісаная ў 1963 г. да 100--годдзя паўстання. У п’есе надзвычай моцна адчуваецца рамантычная плынь. Яе адбітак заўважны не толькі ў спосабе стварэння характараў герояў. Рамантычна абмалёваны і самі падзеі ў творы. К. Каліноўскі ў трактоўцы У. Караткевіча з’яўляецца носьбітам такіх высокіх маральных якасцей, як высакародства, маральная чысціня, адвага, палымянасць. У адносінах з паплечнікамі К. Каліноўскі паказаны як спрактыкаваны кіраўнік і вопытны канспіратар. Важным у ідэйным плане з’яўляецца вобраз каханай Каліноўскага Камілы. З дапамогай гэтага жаночага вобраза аўтар паказаў К. Каліноўскага не толькі як змагара за свабоду, кіраўніка паўстання, але і як чалавека з тонкай пяшчотнай душой і гарачым сэрцам.

Цікавым творчым набыткам аўтара з’яўляецца сімволіка п’есы. Удалым можна назваць вобраз жанчыны ў чорным – Беларусі, з журботнага аблічча і песні якой пачынаецца твор. На нашу думку, вобраз жанчыны ў чорным генетычна звязаны з вобразам Плачкі з кнігі Я. Баршчэўскага *Шляхціц Завальня*. Даследчык М. Хаўстовіч слушна зазначае: „Галоўную ролю ў стварэнні канцэпцыі вобраза Плачкі мог адыграць *Трэнас* М. Сматрыцкага. Плач маці-царквы па сваіх дзецях, што адступіліся ад яе, у Я. Баршчэўскага пераўтвараецца ў плач маці-Беларусі па сваіх падданых”[6]. Таксама як і Плачка, жанчына ў чорным у п’есе У. Караткевіча

[6] М. Хаўстовіч, *На парозе забытай святыні: Творчасць Яна Баршчэўскага*, Мінск 2002, с. 112.

пакутліва перажывае за сваіх сыноў. Не гледзячы на высокія мастацкія вартасці, у п'есе можна адзначыць некаторыя недахопы: гэта празмерная ідэалізацыя герояў, кідкая пафаснасць. Энцыклапедычныя веды аўтара не змяшчаліся ў невялікія рамкі драматычнага твора. Таму заўважаецца некаторая павярхоўнасць у раскрыцці вобразаў, перанасычанасць твора персанажамі.

Сярод здабыткаў беларускай мастацкай прозы пра К. Каліноўскага ў першую чаргу трэба назваць гістарычны раман У. Караткевіча *Каласы пад сярпом тваім*. Створаны ў 1964 г., раман дагэтуль з'яўляецца самым буйным мастацкім творам беларускай літаратуры, у якім увасоблены воблік К. Каліноўскага. У. Караткевіч у творы імкнуўся не проста адлюстраваць драматычныя падзеі нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі ў 60-я гг. XIX ст., але і даць шырокі ахоп гістарычнага мінулага нашай краіны. У цэнтры ўвагі пісьменніка – пярэдадзень паўстання, час, калі нараджалася і выспявала яго задума.

На пачатку рамана К. Каліноўскі паказаны трынаццацігадовым падлеткам. Для свайго ўзросту ён занадта ўдумлівы і сур'ёзны. У далейшым пісьменнік раскрывае і канкрэтызуе вобраз К. Каліноўскага або непасрэдна ў дзеянні, або праз яго лісты да Алеся Загорскага, у якіх будучы ідэолаг паўстання выказвае свае думкі і пачуцці, развагі пра ўласны лёс і лёс краіны. Пісьменнік дае ўласную трактоўку падзеям, этапам фарміравання асобы героя і яго светапогляду. Галоўнае для Караткевіча – не гістарычная праўда, а адлюстраванне духу эпохі, пра якую ён пісаў, раскрыццё характараў, псіхалогіі і жыцця герояў. Героі Караткевіча такія, якімі жадае іх бачыць у ідэале сам аўтар. Аўтарская пазіцыя адносна К. Каліноўскага выразна акрэслена. Яго вобраз намаляваны ў рамане з любоўю і захапленнем. Гэта ідэальны герой, носьбіт лепшых чалавечых якасцей. Хаця ў рамане К. Каліноўскі выступае як пабочны эпізадычны персанаж, але ён увасабляе ідэі палітычнай, сацыяльнай і нацыянальнай незалежнасці Беларусі. Звычайна, К. Каліноўскі з'яўляецца ў рамане ў сферы дзеяння і пошукаў галоўнага героя – Алеся Загорскага. Раскрываючы вобраз К. Каліноўскага праз яго адносіны з Алесем, У. Караткевіч выводзіць на першы план не столькі чалавека, колькі яго справу, ідэю, перакананні. Асноўная функцыя, якую пісьменнік надаў вобразу К. Каліноўскага ў рамане, нам бачыцца ў тым, каб уплываць на духоўнае станаўленне маладога За-

горскага, на фарміраванне яго жыццёвай пазіцыі, а таксама ўвасабляць ідэю нацыянальна-вызваленчага руху.

З празаічных твораў немагчыма таксама абмінуць дакументальную аповесць А. Якімовіча *Кастусь Каліноўскі* (1972), у якой аўтар сцісла, даходліва і праўдзіва расказаў пра супярэчлівыя падзеі 1863-1864 гг., раскрыў прычыны паўстання, складаныя ўмовы, у якіх вымушаны былі змагацца паўстанцы, непаразуменні паміж „чырвоным” і „белым” кірункамі паўстання. Аповесць напісана на гістарычным матэрыяле: у ёй дзейнічаюць сапраўдныя гістарычныя асобы – К. Каліноўскі, В. Урублеўскі, З. Сеакоўскі і інш. Таксама А. Якімовіч выкарыстоўваў матэрыялы архіваў – выпіскі з пратаколаў, рапартаў, тэксты *Мужыцкай праўды* і г. д. Галоўны герой аповесці К. Каліноўскі паўстае як асоба моцная, бескампрамісная, рашучая, упэўненая ў сабе, але разам з тым спагадлівы, чуйны, сумленны чалавек. Шмат увагі ў аповесці надаецца паказу пакутлівых пошукаў К. Каліноўскім шляхоў рэвалюцыйнай барацьбы, яго марам, спадзяванням, сумненням наконт будучыні паўстання.

Сапраўдным мастацкім набыткам стала драматычная паэма А. Куляшова *Хамуціус* (1975). Гэта паэма вылучаецца з шэрагу твораў пра народнага героя. У ёй К. Каліноўскі паказаны ў першую чаргу як чалавек з багатым унутраным светам. А. Куляшоў імкнуўся раскрыць драматызм лёсу галоўнага героя, яго жыццёвыя і філасофскія пошукі, таму ў цэнтры ўвагі аўтара – маральна-філасофскія праблемы. Ідэя твора звязана з канфліктам паміж прыстасавальніцтвам і бескампраміснасцю, вышынёй ідэалаў і прозай жыцця, паміж жаданнем быць шчаслівым і жорсткай няўмольнасцю лёсу. А. Куляшоў працягвае традыцыю ўвасаблення К. Каліноўскага як носьбіта лепшых чалавечых якасцей, шукальніка вышэйшых жыццёвых ісцін, бескампраміснага змагара з прыгнятальнікамі народа. Але ў паэме ён змагаецца не толькі з царскімі служкамі, катамі народа, прадстаўнікамі „белага” жонду. Складаная барацьба адбываецца і ў душы героя: К. Каліноўскі пастаўлены перад пакутлівым выбарам паміж змаганнем за сваю ідэю і асабістым шчасцем, якое абяцае Марыся. Кастусь застаецца верным паўстанню, хоць разумее, што наперадзе яго чакае эшафот:

Там, за акном, – абрыс пятлі мае…
Жыцця, што праўдзе я аддаў дазвання,
Не шкода… Шкода толькі ў час расстання

Мне волі ў поле, як народ пяе,
На небе сонца, на зямлі кахання[7].

Многія даследчыкі звярталі ўвагу на сувязь паэмы А. Куляшова з творчасцю У. Шэкспіра, І. В. Гётэ. У паэме *Хамуціус* – людзі, іх лёсы, страсці, думкі шэкспіраўскія і гётаўскія[8], – адзначае В. Каваленка. Тэкст паэмы пераконвае ў слушнасці такой высновы.

Яшчэ адным творам, прысвечаным паўстанню 1863-1864 гг., з'яўляецца аповесць А. Мальдзіса *Восень пасярод вясны* (1984). Твор цікавы тым, што ў ім аўтар звёў разам паўстанца К. Каліноўскага, паэта У. Сыракомлю, артыстку Г. Маеўскую-Кіркор, селяніна Грыву, царскага чыноўніка Серабракова – прадстаўнікоў розных сацыяльных і культурных слаёў Беларусі. Аўтар імкнецца паказаць гістарычны фон эпохі, становішча і пазіцыі розных класаў у перыяд карэнных грамадскіх зменаў, трагічныя супярэчнасці рэвалюцыйнага руху на Беларусі. Трактоўка вобраза нацыянальнага героя ў А. Мальдзіса мае пэўныя адрозненні ад трактовак іншых пісьменнікаў. У аповесці *Восень пасярод вясны* вобраз К. Каліноўскага не ўзвышаецца і не рамантызуецца. Гэта звычайны чалавек, у яго няма таго арэолу выключнасці і гераічнасці, якім ён надзелены ў іншых творах. Як сцвярджае А. Грыцкевіч, „такога Каліноўскага – заземленага, роўнага сярод роўных чытач яшчэ не ведаў"[9].

У 90-я гг. было дасягнута даволі шмат у асэнсаванні асобы К. Каліноўскага ў беларускай гісторыі і культуры. Працы навукоўцаў пазбавіліся ангажыраванасці і ідэалагізацыі, што panавалі да гэтага ў афіцыйным савецкім літаратуразнаўстве і гістарыяграфіі. Неаднароднасць навуковых трактовак прывяла ў 1990 г. да пачатку палемікі паміж У. Казберуком і М. Бічам, якая тычылася пытанняў рэлігійнай, палітычнай і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі К. Каліноўскага. Шматлікія публікацыі далі нямала цікавых фактаў і звестак пра асобу К. Каліноўскага і некаторыя падзеі беларускай гісторыі, і з'явіліся, на нашу думку, штуршком для пачатку новага этапу адлюстравання вобраза К. Каліноўскага ў беларускай літаратуры. Так, у 2003 годзе з'яўляюцца раман А. Наварыча *Літоўскі*

[7] А. Куляшоў, *Паміж наступным і былым*, Мінск 1995, с. 531.

[8] В. Каваленка, *Жывое аблічча дзён*, Мінск 1979, с. 245.

[9] А. Грыцкевіч, *Напярэдадні паўстання*, „Літаратура і мастацтва",.1984, 14 снежня, с. 7.

*воўк*, апублікаваны ў № 4-6 часопіса „Маладосць”, і п’еса А. Петрашкевіча *Рыцар свабоды*, надрукаваная ў газеце „Наша слова”.

Аўтар рамана *Літоўскі воўк* імкнуўся прапанаваць арыгінальны погляд на падзеі 60-х гадоў XIX стагоддзя на Беларусі, падысці да іх адлюстравання з новага, раней не асветленага боку. Сёння яшчэ шмат застаецца скажэнняў і дэфармаваных уяўленняў пра мінулае. Іх наяўнасць не толькі замаруджвае працэс усведамлення гістарычнай і культурнай спадчыны, але пэўным чынам перашкаджае паўнацэннаму развіццю беларускай літаратуры і культуры ўвогуле. Адным са сродкаў разбурэння скажоных уяўленняў і міфаў з’яўляецца літаратура. Менавіта ў кантэксце такой дэміфалагізацыі з’явіўся раман *Літоўскі воўк*. А. Наварыч не проста стварае цікавы аповед пра адзін з пераломных і ў многім неадназначных перыядаў нашай гісторыі, але імкнецца паказаць аб’ектыўную і праўдзівую карціну жыцця беларускага Палесся напярэдадні і падчас паўстання 1863-64 гг.

А. Наварыч пераважна абмінае вірлівыя падзеі самога паўстання, абыходзіць пытанні „высокай” палітыкі беларускіх паўстанцаў і іх апанентаў. Яго цікавіць не столькі ідэалогія, тактыка і стратэгія паўстання, колькі яго ўнутранае развіццё і супярэчнасці. Падзеі ў творы адбываюцца ў межах невялікага рэгіёна, на Палессі, у той частцы Беларусі, якая была аддалена ад эпіцэнтра палітычных катаклізмаў, жыла сваім уласным, не падобным да іншых, жыццём. Аўтар імкнуўся зацікавіць сваім творам масавага чытача, таму надаў аповеду займальны і дынамічны характар: выкарыстаў напружаную інтрыгу, загадкавасць, напоўніў твор таямнічымі героямі, непрадказальнымі сітуацыямі, вострымі канфліктамі. К. Каліноўскі не з’яўляецца адным з галоўных герояў твора; ён выступае пад маскай таямнічага англічаніна, які займаецца перавозкай зброі і фігуруе ў рамане літаральна ў некалькіх эпізодах. Вобраз змагара ў рамане спрыяе "аўтэнтычнасці" ў перадачы падзей, а таксама з’яўляецца дзейсным сродкам інтрыгі, дадае напружанасці і загадкавасці.

П’еса А. Петрашкевіча *Рыцар свабоды* (2003), прымеркаваная да 140-х угодкаў паўстання 1863 г., прысвечана апошняму перыяду жыцця К. Каліноўскага, калі ён знаходзіўся ў Лукішскай турме. У працэсе следства, падчас размоў арыштаванага з палкоўнікам Шалгуновым, лекарам Фавелiным і іншымі прадстаўнікамі расійскіх улад К. Каліноўскі выказвае свае нацыянальныя і палітычныя погляды, раскрывае сутнасць створанай ім рэвалюцыйнай тэорыі. За шчырымі, палымянымі прамовамі паўстае вобраз

велічнага героя, таленавітага ідэолага паўстання, адданага ідэі незалежнасці роднага краю.

Такім чынам, вобраз К. Каліноўскага шырока прадстаўлены ва ўсіх жанрах беларускай літаратуры: у паэзіі, прозе, драматургіі. Многія з мастацкіх твораў пра беларускага паўстанца сталі літаратурнымі шэдэўрамі. Традыцыя адлюстравання вобраза К. Каліноўскага ў мастацкай літаратуры пачала выпрацоўвацца ў 20-я гг. XX ст. у перыяд беларусізацыі. У творах гэтага часу К. Каліноўскі паказваўся як абаронца не толькі сацыяльнай, але і нацыянальнай свабоды беларускага народа. Пасля згортвання палітыкі беларусізацыі ў 30-я – першай палове 50х гг. назіраецца перыяд своеасаблівай „стагнацыі" ў галіне адлюстравання постаці К. Каліноўскага ў літаратуры. У творах гэтых часоў нацыянальная ідэя амаль цалкам знікае, акцэнт робіцца на сацыяльную барацьбу. У гэты перыяд пісьменнікі імкнуцца паказаць у першую чаргу Каліноўскага-рэвалюцыянера, змагара за сацыяльную справядлівасць, арганізатара паўстання, унутраны свет героя пісьменнікаў амаль не цікавіць. У 60-90-я гг. адбыліся прынцыпова новыя зрухі ў асэнсаванні постаці К. Каліноўскага ў мастацкай літаратуры. Пісьменнікі сталі звяртаць увагу на асобу народнага героя, яго духоўныя пошукі, пачуцці, перажыванні. Неабходна падкрэсліць, што амаль усе беларускія пісьменнікі, пішучы пра К. Каліноўскага, бачылі ў ім перш за ўсё нацыянальнага героя. Імя беларускага паўстанца выкарыстоўвалася для надання творам героіка-патрыятычнай пафаснасці і рамантычнай узнёсласці. Усе намаганні пісьменнікаў былі скіраваны на рамантызацыю, гераізацыю і ідэалізацыю К. Каліноўскага. Можна нават сцвярджаць, што ў беларускай літаратуры прынцыпы рамантычнага адлюстравання рэчаіснасці выпрацоўваліся ў выніку эвалюцыі мастацкага вобраза К. Каліноўскага.

## БІБЛІЯГРАФІЯ

В о л ь н ы А.: Кастусь Каліноўскі, «Савецкая Беларусь», 1925, 15 красавіка.

Г р ы ц к е в і ч А.: Напярэдадні паўстання, «Літаратура і мастацтва», 1984, 14 снежня.

К а в а л е н к а В.: Жывое аблічча дзён, Мінск 1979.

К а в а л е н к а В.: Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры, Мінск 1981.

К у л я ш о ў А.: Паміж наступным і былым, Мінск 1995.

О р л и ц к и й С.: Далёкие годы: роман-хроника, в 3 ч., «Наблюдатель», 1898, № 9.

Т а н к М.: Кастусь Каліноўскі, у: Жыві ў свободзе: Кніга пра Каліноўскага, Мінск 1996.

Х а ў с т о в і ч М.: На парозе забытай святыні: Творчасць Яна Баршчэўскага, Мінск 2002.
Ш а л ь к е в і ч В.: Ля вытокаў, «Літаратура і мастацтва», 1990, 12 кастрычніка.

## EWOLUCJA OBRAZU KASTUSIA KALINOWSKIEGO W LITERATURZE BIAŁORUSKIEJ

S t r e s z c z e n i e

Artykuł przybliża postać K. Kalinowskiego, znanego białoruskiego działacza politycznego, jednego z przywódców powstania listopadowego, publicysty i pisarza. Autorka analizuje wiele utworów literatury białoruskiej XX i początku XXI w., takich jak dramaty *Kastuś Kalinowski* E. Mirowicza oraz *Kastuś Kalinowski. Śmierć i nieśmiertelność* U. Karatkiewicza, a także jego powieść *Kłosy pod sierpem twoim*, poemat A. Kuleszowa *Chamutius*, opowieść A. Maldzisa *Jesień w środku wiosny*, powieść A. Nawarycza *Litewski wilk* i in. Śledzi ewolucję postaci Kalinowskiego: od gloryfikacji jego imienia poprzez wzniesienie go do rangi bohatera narodowego w czasach odrodzenia i popularyzacji idei białoruskiej po całkowite przemilczenie i brak zainteresowania w okresie trwającego na Białorusi kryzysu narodowego.

**Słowa kluczowe:** obraz, epoka, gatunek, narodowe i socjalne, idealizacja, bohater romantyczny.
**Ключевые слова:** художественный образ, эпоха, жанр, национальное и социальнае, идеализация, романтический герой.
**Key words:** image, epoch, genre, national and social, idealisation, romantic hero.